# ХРЫСТУС УВАСКРОС, І ЁН З НАМІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы толькі можам уявіць сабе стан тых жанчын! Яны былі перапалоханы ўбачаным і пачутым. І гэта не дзіўна. Тое ж самае было б з намі, калі б мы трапілі ў падобную сітуацыю.

Хоць і перапужаныя, яны, аднак, дзеляцца гэтай радасцю з апосталамі. Пётр і Ян імгненна бягуць да магілы, каб пацвердзіць факт уваскрэсення Езуса і паверыць.

Гэты храналагічны евангельскі аповед з'яўляецца фундаментальным для нашай веры. Ён кардынальна змяніў жыццё апосталаў і таксама павінен змяняць наша жыццё, бо мы не адны і з намі ўваскрослы Езус — наша надзея.

Ён уваскрос! Ніхто і ніколі не мог сказаць больш падбадзёрваючых слоў, чым гэтыя. Уваскрэсенне Хрыста — гэта дзень, які Пан учыніў, і падзея, у якой мы з радасцю ўдзельнічаем.

Мы завяршылі Вялікі пост — час нашага духоўнага ўваскрэсення. У духоўнай вандроўцы разам з церпячым Езусам мы прыйшлі да сённяшняга радаснага дня. У Вялікую пятніцу мы перажывалі драму Кальварыі. Сын Божы добравольна аддаў сваё жыццё за нас, каб выбавіць з улады злога духа і палону граху. Нявінны аддаў сваё жыццё за вінаватых і грэшных. Ці можа быць большая любоў?

Дзякуючы Пасхальнай таямніцы, крыж як дрэва ганьбы і нечалавечых цярпенняў перамяніўся ў знак перамогі, любові і надзеі. Укрыжаваны Езус прыгадвае нам аб Божай любові і Яго бязмежнай міласэрнасці, якая праявілася ў Яго збаўчай смерці і ўваскрэсенні. Збаўчы акт Хрыста змяшчае адначасова Крыж і Уваскрэсенне.

Пасхальная таямніца смерці і ўваскрасення Хрыста адкрывае нам схаваную праўду пра Бога. Здаецца, што Крыж на Кальварыі закрывае Яго магчымасці. Але на самай справе крыжовая смерць Езуса — гэта не канец, але пачатак. Гэта толькі пункт часовага затрымання, як быццам аўтобусны прыпынак. Як пасля прыпынку аўтобус едзе далей, таксама і Хрыстус сваёй боскай моцай не спыняецца і працягвае дзейнічаць.

Калі Вялікая пятніца была чалавечым «НЕ» Богу, то велікодны ранак стаў Божым «ТАК» чалавеку. Чалавек створаны не для смерці, але для жыцця, якое атрымаў дзякуючы Пасхальнай таямніцы. Велікодная раніца пацвердзіла ўсёмагутнасць Бога і тое, што Ён, а не хтосьці іншы, нават самы моцны гэтага свету, з'яўляецца яго Валадаром.

Сёння з верай мы павінны прыняць праўду аб тым, што дрэва ганьбы сталася дрэвам бязмежнай любові Бога да чалавека. Больш за тое, Ён заўсёды ёсць з намі. З намі ёсць Бог Любові, які так палюбіў свет, што аддаў свайго Сына, каб нас збавіць. Таму слова «любоў» з'яўляецца ключавым словам Пасхальнай таямніцы. На яе мы пакліканы адказаць падобнай любоўю, якая павінна праяўляцца ў нашых адносінах да Бога і бліжняга.

Гэта любоў ужо 2 тысячы гадоў фарміруе Божы народ і вядзе яго шляхам збаўлення. Гэта тая самая любоў, якая аберагае і ўмацоўвае нашу веру. Касцёл абапіраецца на гэтую Божую любоў, каб паспяхова выконваць сваю місію і найперш абвяшчаць Бога, імя якога «міласэрнасць», як кажа Папа Францішак.

У эйфарыі сённяшняга свята мы не можам забыцца аб праблемах, з якімі сустракаецца сёння Касцёл і хрысціянская вера наогул. Гэта найперш фізічны пераслед, асабліва на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы. Там, у калысцы нашай веры, вызнаўцы Хрыста штодзённа плацяць сваім жыццём або павінны пакідаць родныя мясціны толькі таму, што такімі з'яўляюцца.

У многіх краінах свету прымаюцца законы, якія супярэчаць Божаму закону, і само хрысціянства высмейваецца. Людзі не прымаюць удзел у набажэнствах, не моляцца, не захоўваюць Божыя запаведзі і г.д. З'яўляецца ўсё больш абыякавых, намінальных хрысціян, якіх на самай справе нічога, акрамя пасведчання аб хросце, не злучае з Касцёлам. Хрысціянскія ўрачыстасці і трыдыцыі для многіх становяцца як быццам фальклорам і нагодай добра правесці час без усведамлення іх глыбокага рэлігійнага сэнсу. У Еўропе ўжо ёсць краіны, дзе праблемай становіцца крыж на шыі веруючага ці на адзенні на месцы працы. Гэта не што іншае, як праяўленне дэхрысціянізацыі і дэсакралізацыі нашага жыцця. Губляецца сапраўдны сэнс хрысціянства, і яно знаходзіцца ў вялікай небяспецы ў сучасным свеце, які з касмічнай хуткасцю секулярызуецца.

Гістарычна хрысціянская Еўропа ўсё часцей дабравольна адмаўляецца ад сваёй хрысціянскай спадчыны і каранёў і становіцца постхрысціянскай. А калі і ўспамінае аб хрысціянстве, то без аднясення да канкрэтнай веры ў Хрыста і захавання хрысціянскіх каштоўнасцяў. Наш кантынент становіцца шматкультурным, так што нават у штодзённы абыход увайшоў тэрмін мульці-кульці-грамадства без ясна выражанай рэлігійнай прыналежнасці.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На гэтую праблему і вынікаючую з яе духоўную і сацыяльную небяспеку звярнулі ўвагу Папа Францішак і Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл у падпісанай сумеснай заяве падчас гістарычнай сустрэчы, якая мела месца 12 лютага 2016 года ў Гаване на Кубе. Яны выказалі сваю занепакоенасць сітуацыяй, калі ў многіх краінах свету хрысціяне сустракаюцца з абмежаваннем рэлігійнай свабоды і правам сведчыць аб сваіх рэлігійных перакананнях і жыць паводле іх.

Яны таксама падкрэслілі, што палітыка секулярызацыі вядзе да небяспекі ў галіне свабоды веравызнання. Некаторыя палітычныя сілы, кіруючыся ідэалогіяй секулярызму, які нярэдка прымае агрэсіўныя формы, імкнуцца выцесніць хрысціянства на перыферыю грамадскага жыцця. У той жа час еўрапейская інтэграцыя павінна паважаць рэлігійную тоеснасць сваіх грамадзян. Будучы адкрытай на іншыя рэлігіі, Еўропа, тым не менш, павінна заставацца вернай сваім хрысціянскім караням і захаваць сваю хрысціянскую душу.

Вельмі часта ў сваім духоўным жыцці мы кіруемся ідэямі паліткарэктнасці ў галіне рэлігіі і свабоды веравызнання і робім усё, каб толькі спадабацца людзям з іншымі, нават секулярнымі, перакананнямі, забываючыся пры гэтым пра свае. Зразумела, што трэба з пашанай ставіцца да перакананняў іншых людзей. Але ў той жа час нам, хрысціянам, нельга страціць сваёй хрысціянскай тоеснасці і недапушчальна не бараніць хрысціянскіх каштоўнасцяў.

Пазіцыя абыякавасці і індыферэнтнасці адносна нашай веры і захавання прынцыпаў Евангелля — гэта не што іншае, як балючы нарыў на целе сучаснага хрысціянства. Яго неабходна як мага хутчэй апераваць, каб не пачалася духоўная гангрэна і не атруціўся ўвесь арганізм.

Калі мы сцвярджаем, што з'яўляемся хрысціянамі, то павінны змагацца за нашу веру і яе сведчыць у штодзённым жыцці. Мы павінны таксама будаваць масты паміж рознымі хрысціянскімі веравызнаннямі, каб сумесна сведчыць Евангелле, яго бараніць і абвяшчаць. Нам неабходна весці дыялог з нехрысціянскімі рэлігіямі, каб разам вырашаць узнікаючыя праблемы, бо існуючыя розніцы ва ўспрыманні рэлігійных ісцін не павінны перашкаджаць людзям розных веравызнанняў жыць у міры і згодзе.

Падчас доўгіх дзесяцігоддзяў ганенняў на веру наш народ заплаціў высокую цану за свабоду веравызнання. Гэта вялікі дар Божай міласэрнасці, прадказаны Марыяй у Фаціме ў далёкім 1917 годзе. Але гэта таксама вялікае і адказнае заданне — не дапусціць размывання гэтага дару ў мутнай вадзе секулярызму і не страціць яго. Таму мы павінны мужна супрацьстаяць усялякім праяўленням спакусаў рэлігійнай паліткарэктнасці, якія аслабляюць і нішчаць нашу веру, каб крочыць за ўваскрослым Хрыстом у марафоне нашага жыцця.

Ва ўсіх яго абставінах мы павінны заставацца вернымі нашаму хрысціянскаму пакліканню, якое бярэ свой пачатак у сакрамэнце хросту, што з'яўляецца маркерам нашай хрысціянскай тоеснасці. Менавіта ім пазначаны тыя, хто ідзе шляхам Хрыста, гэта азначае тыя, хто памёр для граху і ўваскрос для новага духоўнага жыцця. Гэтым духоўным маркерам пазначаны кожны хрысціянін, які ў сакрамэнце хросту ўключыўся ў Хрыста і прабывае з намі ў служэнні Касцёла.

Уваскрэсенне Езуса ёсць знакам уваходу ўваскрослага Бога ў наша жыццё і Яго радыкальнага дзеяння ў свеце. Уваскрослы Хрыстус аб'яўляе нам прыроду і логіку не суду, але Божай міласэрнасці. Ён як быццам прамаўляе да нас: «Паглядзі, чалавек, ты забіў Мяне, але Я прыходжу да цябе з пасланнем міру, бо хачу, каб ты разам са Мною вярнуўся да жыцця».

Таму вызнаўцы Хрыста павінны адзначацца згодным з Яго вучэннем жыццём. Гэта азначае, што наш позірк павінен быць скіраваны не на нас саміх і на нашы індывідуальныя справы, але на Божыя. Ён таксама павінен быць скіраваны на духоўныя і матэрыяльныя патрэбы іншых, як да гэтага заклікае Папа Францішак у Юбілейным Годзе Божай Міласэрнасці.

Свята Пасхі — гэта магутнае «ТАК» Бога для дабра чалавека. Гэта надзея, нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія сёння перажывае хрысціянства і свет. Гэта дар для ўсяго чалавецтва, што ў Хрысце смерць перамяняецца ў жыццё. Таму разам з анёламі мы павінны казаць: «Езуса няма ў магіле. Ён уваскрос і ёсць сярод нас!»

Пасля трох пакаленняў ганенняў і пераследу Каталіцкі Касцёл у Беларусі перажывае сваю Пасху. У гэтым Юбілейным Годзе Божай Міласэрнасці мы адзначаем сярэбраны юбілей адраджэння касцёльных структур і ўстанаўлення св. Янам Паўлам ІІ Мінска-Магілёўскай мітраполіі. Галоўныя ўрачыстасці адбудуцца ў Будславе 1-2 ліпеня гг.

Сёлетні пастырскі дэвіз «Надзея ў Божай міласэрнасці» ўключае ў сябе падрыхтоўку да гэтага юбілею. Яе складнікам з'яўляюцца пастырскія візітацыі з мэтай падсумавання дасягненняў і пошуку шляхоў удасканалення.

Адраджэнне структур Каталіцкага Касцёла ў Беларусі і яго развіццё яшчэ раз пацвярджае праўду Уваскрэсення Хрыста. Езус, якога цягам трох пакаленняў атэістычныя сілы на нашай зямлі спіхвалі ў магілу і хацелі пахаваць, уваскрос і ўваходзіць у наша жыццё. Ён жыве, Ён з намі, і з Ім жыве Беларусь.

Дарагія браты і сёстры! Віншую ўсіх вас з радасным і збаўчым святам Пасхі Хрыстовай!

Няхай уваскрослы Езус будзе крыніцай нашага жыцця, каб з вечна жывой Пасхальнай таямніцы мы чэрпалі духоўныя сілы, былі мужнымі сведкамі і місіянерамі хрысціянскай веры.

Складаю свае найлепшыя святочныя пажаданні хрысціянам іншых канфесій, якія сёння разам з намі адзначаюць гэтае свята святаў.

Віншую праваслаўных братоў і сясцёр. Жадаю ім поспеху ў духоўнай падрыхтоўцы да святаў Пасхі, радасць якой мы будзем раздзяляць разам з вамі, каб, умацаваныя ласкай Пасхальнай таямніцы, мы маглі плённа супрацоўнічаць у галіне абвяшчэння і абароны хрысціянскіх каштоўнасцяў.

Віншую ўсіх людзей добрай волі! Езус збавіў усіх людзей, і ў Ім наша надзея.

Радаснай, поўнай ласкі ўваскрослага Пана, свята Пасхі Хрыстовай і Яго супакою!

Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос! І Ён з намі!

Раздзяляючы разам з усімі вамі ласку пасхальнай падзеі, свае пажаданні ўмацоўваю благаслаўленнем у імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

**Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ,**
**Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.**


**Открытое акционерное общество**

**«Стройтрест №7»**

Учетный номер плательщика: **100512859**
Вид экономической деятельности: **строительство**
Организационно-правовая форма: **открытое акционерное общество**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220005, г. Минск, пр. Машерова, 16**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года**

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 84 296 | 75 157 |
| Нематериальные активы | 120 | 29 | 43 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | | |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 127 | 39 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 571 | 585 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 1 111 | 1 168 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **86 134** | **76 992** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 113 605 | 97 740 |
| В том числе: материалы | 211 | 105 069 | 90 831 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | - |
| незавершенное производство | 213 | 8 003 | 6 700 |
| готовая продукция и товары | 214 | 533 | 209 |
| товары отгруженные | 215 | | - |
| прочие запасы | 216 | | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 4 128 | 1 403 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 763 | 755 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 467 722 | 474 320 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 39 497 | 51 921 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 72 188 | 19 654 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **697 903** | **645 793** |
| **БАЛАНС** | **300** | **784 037** | **722 785** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2015 года** | **На 31 декабря 2014 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 129 | 129 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | | - |
| Резервный капитал | 440 | | - |
| Добавочный капитал | 450 | 56 330 | 51 319 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 117 189 | 133 984 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | - |
| Целевое финансирование | 480 | 11 | 237 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **173 659** | **185 669** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 35 083 | 2 950 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **35 083** | **2 950** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 39 305 | 34 078 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 463 788 | 480 424 |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 404 886 | 372 274 |
| по авансам полученным | 632 | 13 868 | 53 542 |
| по налогам и сборам | 633 | 11 684 | 15 395 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 5 311 | 8 716 |
| по оплате труда | 635 | 18 098 | 26 099 |
| по лизинговым платежам | 636 | 225 | 23 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | | - |
| прочим кредиторам | 638 | 9 716 | 4 375 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 14 | 10 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | 72 188 | 19 654 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **575 295** | **534 166** |
| **БАЛАНС** | **700** | **784 037** | **722 785** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года**

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 1 285 985 | 1 178 916 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (1 060 796) | (852 592) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 225 189 | 326 324 |
| Управленческие расходы | 040 | (175 581) | (162 902) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 49 608 | 163 422 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 96 378 | 75 862 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (124 158) | (100 305) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 21 828 | 138 979 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 500 | 535 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 224 | 264 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 6 | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 270 | 271 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (196) | (736) |
| В том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (66) | (71) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (130) | (665) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 3 873 | 6 206 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 3 | |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 3 870 | 6 206 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (7 589) | (5 480) |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | (1 561) | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (132) | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (5 896) | (5 480) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | (3 412) | 525 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 18 416 | 139 504 |
| Налог на прибыль | 160 | (11 633) | (30 294) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | (28) | (2) |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 6 755 | 109 208 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 4 912 | 4 023 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 11 667 | 113 231 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Б.М. Шерман
Главный бухгалтер С.В. Рапинчук